

# СТАЛПЕЦ Іосіф Цэзаравіч

Нарадзіўся 14.05.1941 года ў в. Самаравічы Зэльвенскага раёна, Гродзенскай вобласці. У лёсе Іосіфа Цэзаравіча вайна пакінула свой адметны след.

У лютым 1943 года сям'ю Сталпец адправілі ў Крамяніцкую камендатуру, а адтуль на грузавой машыне адвезлі на чыгуначную станцыю ў г.Ваўкавыск. Пасля адправілі ў канцэнтрацыйны лагер у г. Гродна, але сям'і Сталпец пашчасціла, і доўга ў лагеры яны не затрымаліся: адтуль адправілі ў г.Беласток, дзе іх чакалі нямецкія баўэры. Немец Орст Грыгуль забраў сям'ю ў свой маёнтак для догляду гаспадаркі, так як сям'я была вясковая. Іосіфу Цэзаравічу тады было 2,5 гады. Калі нямецкія гаспадары пачулі, што войскі Чырвонай Арміі набліжаюцца да Польшчы, то перапраўілі ўсіх наёмных рабочых да сваёй радні ў пасёлак пад Берлінам, у памесце Хюгілёрт. Там сям'я Сталпцоў прабыла да 1945года

Пасля вызвалення сям'і Сталпцоў з палону на іх вопратку нашылі літары BR, што азначала беларусы. Прапанавалі на выбар застацца ў Германіі, Польшчы, Англіі і нават Канадзе, так як сям'я па нацыянальнасці палякі, але бацька сказаў, што хацелі б вярнуцца дамоў.

1 верасня 1948 года Іосіф Цэзаравіч паступіў у 1 клас Самаравіцкай сямігадовай школы і скончыў яе ў 1955 годзе. Пасля заканчэння Крамяніцкай сярэдняй школы юнак паступае ў Ленінградскае рамесніцкае вучылішча па спецыяльнасці столяр – чырванадрэўшчык. Скончыўшы вучылішча, прыйшоў на работу ў будаўнічую арганізацыю Глаўленінградстрой, будавалі палац культуры ў Выбаргу.

Пасля службы ў арміі паступіў у Мінскі інстытут фізічнай культуры і стаў трэнерам па лёгкай атлетыцы. У 1983 годзе прыйшоў на працу ў Князеўскую сярэднюю школу настаўнікам фізічнай культуры і кіраўніком ваеннай падрыхтоўкі і працаваў да выхаду на заслужаны адпачынак да 2002г.

Не адно пакаленне выхаваў настаўнік Сталпец. У хлопчыкаў выхоўваў пачуццё гонару за сваю Радзіму, добрых адносін да людзей, якія знаходзіліся побач, узаемавыручцы і ўзаемадапамозе. У час працы ў Князеўскай сярэдняй школе Іосіф Цэзаравіч прымаў удзел у пошуках загінуўшых салдат на тэрыторыі Крамяніцкага сельскага Савета з роднымі пахаваных салдат у вёсцы Князева: малодшага лейтэнанта Літвінава, сяржанта Малінкіна, старэйшага сяржанта Папернага, вёў перапіску з роднымі з Туркменіі Оразмамедава Алі – Аглы.

Малалетні вязень Сталпец І.Ц. узнагароджаны 10 медалямі, з іх - спецыяльным медалём “Вязень нацызму”.

У 2024 годзе Іосіфа Цэзаравіча Сталпца не стала. Пахаваны на могілках у в.Крамяніца Зэльвенскага раёна, Гродзенскай вобласці.